# КОЛА РЭМЕЙКАЎ

**Г.М. Шуплякова**

Своеасаблівым з'яўляецца выкарыстанне міфалагемы кола ў "Старасвецкіх міфах горада Б*" Людмілы Рублеўскай. Гэтае выкарыстанне хоць і не ляжыць на паверхні, але значэнне сваё ад гэтага зусім не траціць.

"Старасвецкія міфы..." "згодна з класіфікацыяй паўтаральнага мастацтва У.Эка, можна аднесці да разнавіднасці рымейка" [1, 58]. Пісьменніца знарок акцэнтуе ўвагу на тым, што асновай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кожнага твора з'яўляецца старажытнагрэчаскі міф, змешчаны ў эпіграфе. Гэтым самым спачатку задаецца класічная сітуацыя, а потым яна праецыруецца на сучаснасць (пачатак ХХст.) і там жа вырашаецца. Прычым гэтае вырашэнне можа адрознівацца ад старажытнагрэчаскага, што абумоўлена перш за ўсё часам дзеяння.

Літаратура заўсёды звярталася да міфалогіі, прычым не толькі ў сувязі з жанрава-тэматычнымі запатрабаваннямі. Міфалогія – гэта канцэтрацыя сімвалізаванага вопыту папярэдніх пакаленняў. Таму пісьменнікі час ад часу звяртаюцца да гэтага вопыту, каб вырашыць праблемы сучаснай ім рэальнасці. Больш таго, яны імкнуцца знайсці пэўныя правілы паводзін у той ці іншай сітуацыі, якія можна выкарыстаць у сучаснасці, знайсці падтрымку, пацверджанне сваім меркаванням.

Гэткім жа шляхам і Л.Рублеўская імкнецца знайсці выйсце са сфармаваўшыхся вакол яе неспрыяльных абставін. Яна выбірае міфы, якія могуць ёй дапамагчы і разглядае іх у кантэксце больш-менш сучаснай ёй рэальнасці. У выніку гэтага пісьменніца можа атрымаць адказ на сваё пытанне, ці хаця б знайсці правільны кірунак для далейшых пошукаў.

Гэтая думка мае наступнае абгрунтаванне. У "Старасвецкіх міфах горада Б*" Л.Рублеўская перарабляе старажытнагрэчаскія міфы, якія не маюць паміж сабой нічога агульнага: ні месца дзеяння, ні час дзеяння, ні галоўных персанажаў. Тыя міфы нагадваюць сабой адасобленыя адзінкі. Апрацаваныя ў кантэксце больш сучасным, яны яднаюцца паміж сабой у адзін ланцуг. Прычым першае і фінальнае звенні вылучыць нельга, бо пачатак і канец злучаныя адзін з адным. І такім чынам ланцуг рымейкаў утварае кола, у сярэдзіне якога знаходзіцца сам аўтар. Гэтак ён спрабуе сканцэнтраваць вакол сябе магчымыя веды і вопыт пакаленняў для выкарыстання іх у вырашэнні складаных жыццёваважных задач. І адначасова гэтае мастацкае кола ахоўвае яго, абараняе ад асяроддзя, у якім адчувае сябе стваральнік няўтульна.

Невыпадкова разнастайныя архітыпічныя мадэлі і сітуацыі згуртаваныя у межах аднаго месца, горада Б*. А якую форму маюць межы горада, як ён наогул будаваўся і вакол чаго? Па вялікім рахунку, межы гарадскія маюць або нагадваюць сабой форму кола. Абумоўлена гэта тым, што ў старажытныя часы будаваліся яны вакол чаго-небудзь (напрыклад, крэпасці). Вакол. Гэта значыць, акалялі цэнтр. З гэтага, у сваю чаргу вынікае, што і старасвецкія міфы акляюць нейкі цэнтр, утвараючы пры гэтым горад Б*. (Бо ўсё, што мы ведаем пра месца дзеяння, гэта толькі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тое, што ён насычаны, можна сказаць, збудаваны з тых міфаў). Горад Б* і ёсць сукупнасць асучасненых класічных жыццёвых мадэляў. А мадэлі тыя групуюцца вакол аўтара, які намагаецца прачытаць сімвалізаванае значэнне кожнай з іх, вызначыць сваё месца ў сённяшнім дні, не згубіцца ў хуткай змене падзей.

"Я" пісьменніцы з'яўляецца для іх так званым цэнтрам светаўладкавання, дзякуючы якому мадэлі не распадаюцца, існуюць у цэласным адзінстве. Гэта як Сусвет, у аснове якога наша Сонечная сістэма, дзе ўсё і ўсе ўзаемазалежныя. Так і ў нашым выпадку. Да цэнтру цягнецца міф-рэмейк, астатнія рэмейкі дапамагаюць яму не выйсці за межы дзеяння твора. Такая зладжанасць мастацкай сістэмы дазваляе стварыць новае асяроддзе, новую рэальнасць, дзе асобныя, здавалася б, невырашальныя пытанні знаходзяць свае адказы.

Такім чынам, кола ў творы ўвасабляе сабой абмежаваную прастору з цэнтрам прыцягнення. Гэта робіць разуменне і ўспрыняцце архітыпічных мадэляў больш цэласным і ўсебаковым.

"Так" Старасвецкія міфы...", набываючы новую сэнсавую афарбоўку ствараюць адчуванне прыналежнасці да духоўных традыцый, якія садзейнічаюць таму, каб творы Л.Рублеўскай калі не здымалі, то змякчалі трагічныя супярэчнасці асабістага быцця сучасніка пазачасавай адвечнасцю міфалагічных форм. А разам з сакраментальным разуменнем тых ці іншых міфалагем адчуваецца і аўтарская жаданне выйсці за межы традыцыйнага міфа" [1, 60].

1. Ханеня С.І. Амплітута мастацкасці: Умоўнасць у беларускай прозе канца XX стагоддзя. – Гомель, 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ